З каталіцкага друку (153)

Аўтар: Кінга Красіцкая
10.12.2017 00:00

CatholicNews.by

У Польшчы забаранілі
гандаль па нядзелях

Такім чынам палітычныя ўлады ў суседняй краіне працягваюць укараняць у жыццё яе жыхароў хрысціянскія каштоўнасці. Закон уступіць у сілу з 1 сакавіка 2018 года. З гэтага дня забарона на гандаль па нядзелях будзе распаўсюджвацца на кожную 2-ую нядзелю месяца. З 2019 года крамы ў Польшчы адчыняць па нядзелях толькі раз на месяц, а з 2020 года гандаль у кожную нядзелю цалкам забароняць. Але ёсць выключэнне: гандляваць змогуць інтэрнэт-крамы і гандлёвыя аб'екты, якія знаходзяцца на аўтамабільных заправачных станцыях.
†

Radio Vaticana

"Ружанец на ўзбярэжжы"
за жыццё і веру

Малітоўная акцыя пад такой назвай адбылася ў Ірландыі. Па прыкладзе польскага "Ружанца да межаў", які сабраў звыш мільёна вернікаў, ірландскія католікі маліліся ў інтэнцыі жыцця ненароджаных дзяцей, а таксама духоўнага і маральнага аднаўлення народа. У суме малітва адбывалася ў 280-ці месцах краіны.

Падзея была запланавана на апошнюю нядзелю лістапада невыпадкова. Ірландыя стала першай у свеце краінай, якая аддалася пад апеку Хрыста Валадара.

wiara.pl

Вынаходлівыя
шопкі ў Італіі

У Асізі ў стаенцы змясцілі 444 гільзы. У Балоніі туды паставілі мініяцюрны пантон. Гільзы ад баявых патронаў аказаліся ў шопцы, зладжанай на плошчы перад ніжнім касцёлам базілікі св. Францішка ў Асізі. Як патлумачыў кусташ мясцовага кляштара францысканцаў, іх лік роўны колькасці духоўных і свецкіх асоб, якія страцілі

сваё жыццё “па рэлігійных прычынах” з пачатку 2000-х гг.

У шопцы ў Кастэнаса пад Балоніяй мэр горада Стэфана Сэрмэнджы, яе галоўны будаўнік, пастанавіў змясціць разам з фігурамі Дзіцятка, Марыі і Юзафа, а таксама жывёл мініяцюру пантона – асноўнага сродка перамяшчэння эмігрантаў, якія прыбываюць у Італію марскім шляхам. Мэр патлумачыў, што зрабіў гэта, каб прыцягнуць увагу людзей да праблем міграцыі.